*Л. У. Ляховіч*

# СУАДНОСІНЫ ДУХОЎНАЙ І СВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ЕЎРОПЕ РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ

На працягу ўсёй гісторыі грамадства суадносіны духоўнай і свецкай улады былі актуальнымі і часта праблематычнымі. Ступень важнасці і вастрыні названай праблемы вагалася ў залежнасці ад агульнай карціны свету, ступені секулярнасці ці сакралізаванасці грамадства, наяўных суадносін сіл царквы і дзяржавы, суб'ектыўнага фактару ў гісторыі і г.д.

Еўрапейскае грамадства ранняга Новага часу (XVI–XVIII стст.) мела велізарны вопыт адносін царкоўнай і свецкай улады. Прызнаўшы хрысціянства спачатку роўнай з астатнімі рэлігіямі Міланскім эдыктам 313 г., імператары Канстанцін і Ліцыній выдалі шэраг указаў 313, 315, 319, 321, 323 гг., якія забяспечылі хрысціянскай царкве прывілеяванае становішча. Стаўшы адзіным імператарам у 323 г., Канстанцін распаўсюдзіў дзеянне гэтых законаў на ўсю імперыю. Імператарская ўлада добра разумела, што аўтарытэт хрысціянства і колькасць вернікаў робяць бессэнсоўнымі рэпрэсіўныя меры, між тым як саюз імперыі і царквы будзе ўзаемакарысны і канструктыўны. У сваю чаргу, умацаваўшыся афіцыйна, хрысціянская царква пачала інтэнсіўную дзейнасць па выпрацаўцы дагматыкі і вырашэнні багаслоўскіх спрэчак. У познерымскі перыяд, калі імператарская ўлада на Захадзе слабела і існавала апошнія дзесяцігоддзі, а царква была занятая станаўленнем і багаслоўскімі пошукамі, не было глебы для катэгарычнага вырашэння пытання, хто галоўны, – імператар ці рымскі епіскап, які з V ст. стаў называцца папам.

У раннім Сярэднявеччы ўлада папства ўзмацнілася. У «цёмныя вякі», калі не існавала ні трывалых меж, ні законаў, ні моцнай свецкай улады, калі ствараліся і такім жа чынам разбураліся эфемерныя палітычныя саюзы варварскіх каралёў, а сярод сапраўды трывалых дзяржаў сябе пазіцыянравала толькі Візантыя, практычна толькі хрысціянская царква ўяўляла сабой сімвал стабільнасці і спадзяванняў у грамадстве, а духоўным і палітычным яе сімвалам быў Рымскі першасвятар – папа. Папы ў гэтыя часы карысталіся ўладай і аўтарытэтам, выступаючы не толькі як арбітры ў міжнародных спрэчках, але і ўзмацняючы сваю ўладу ў Рыме. Сабраўшы ў сваіх руках зямельныя валоданні, яны стварылі

«патрымонію св. Пятра». Атрымаўшы у франкскага караля Піпіна Кароткага аднятыя ім у лангабардаў землі па Цібры і ў вобласці Равены («дар Піпіна»), папы ў 756 г. стварылі Папскую вобласць. «Дар Піпіна» стане асновай асабліва цесных адносін папства і французскай манархіі ў будучым. Актыўна ўмешваючыся ў свецкае жыццё, кіруючы епіскапатам, папы прэтэндуюць на сусветнае главенства, хаця і сустракаюць у гэтым супраціўленне як з боку канстанцінопальскага патрыярха, так і заходняй свецкай ўлады. Падобнае незалежнае становішча адрознівала папства ад візантыйскіх царкоўных іерархаў, дзе царква была падпарадкавана імператарскай уладзе.

У Высокім Сярэднявеччы становішча папства працягвае ўзмацняцца. Правёўшы шэраг рэформаў і ўзмацніўшыся ў выніку Клюнійскага руху, папства пасля расколу 1054 г. дасягае практычна максімальнага палітычнага ўзвышэння над свецкай уладай феадальна раздробленай Еўропы. Разам з тым моцнае супраціўленне папскай уладзе аказвалі германскія імператары, якія бачылі ў аднаўленай Імперыі спадкаеміцу Рыма і не жадалі падпарадкоўвацца царкоўнай уладзе. Добра вядомыя ў гэтым кантэксце дзейнасць папы Інакенція III, а таксама канфлікт германскага імператара Генрыха IV і Грыгорыя VII. Тым не менш па меры ўзмацнення свецкай улады ў познім Сярэднявеччы папы, нягледзячы на сваю актыўнасць, уступаюць першынство ў палітычным жыцці свецкай уладзе і прызнаць свецкі дзяржаўны суверэнітэт. Увасабленнем гэтай барацьбы з’яўляецца канфлікт папы Баніфацыя VIII і французскага караля Філіпа IV, вынікам якога стаў «авіньёнскі палон» пап і некалькі дзесяцігоддзяў царкоўнага расколу.

Ранні Новы час характэрны шэрагам адметнасцей. Гэта перыяд Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, фарміравання класічнай навукі і новай карціны свету, Рэнесанса і Рэфармацыі, а таксама станаўлення еўрапейскіх абсалютных манархій. Значна ўмацаваўшыся пасля падзення Візантыі, папства жорстка змагаецца з ерасямі, але Рэфармацыя аказваецца цяжкім выпрабаваннем, прычым не толькі для царкоўнай, але і для свецкай улады.

Свецкая ўлада ўжо не мае патрэбы адстойваць сябе ў барацьбе з папствам. Ва ўмовах Рэфармацыі еўрапейскія манархі яшчэ больш узмацняюць сваю ўладу. Дадзены працэс добра адлюстраваны ў расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі і, у прыватнасці, у працах М. І. Карэева (1850–1931). Сутнасць сацыяльнай палітыкі

абсалютызму Карэеў выражае наступным чынам. Пасля перамогі над феадалізмам (феадальным патрыкулярызмам і раздробленасцю) і каталіцызмам (прэтэнзіямі папства і каталіцкай царквы) манархічная ўлада адняла ў святарства і дваранства іх палітычныя правы, аднак пакінула і нават узяла пад абарону іх сацыяльныя прывілеі і панаванне над духоўным жыццём грамадства. Наогул жа і саслоўная манархія, і абсалютызм ігнаравалі народныя інтарэсы [1, с.55–57]. Абсалютная манархія магла служыць справе культурнай і сацыяльнай рэакцыі, што мела месца ў перыяд контррэфармацыі (пры гэтым Карэеў прымяняе эпітэт «веравызнаўчы» і прыдворны абсалютызм XVI і XVII стагоддзяў), ці магла зрабіцца сродкам прагрэсу, што ўвасобілася ў «асвечаным абсалютызме» XVIII ст. [1, с.55].

Рэфармацыя і контррэфармацыя мелі, паводле Карэева, важнае значэнне для абсалютных манархій. Праведзеныя «зверху» манархічныя рэфармацыі ў Прусіі, Даніі, Швецыі, Англіі мелі сваім вынікам не толькі вызваленне ад папскай ўлады, але і ўзмацненне самой манархічнай улады ў дзяржаве, калі каралі рабіліся, як у Англіі, главамі цэркваў. Секулярызацыя царкоўнай маёмасці яшчэ больш узмацняла каралеўскую ўладу [2, с.76–77].

У краінах, дзе афіцыйныя ўлады падаўлялі Рэфармацыю, манархія была ў саюзе з царквой. У сваю чаргу каталіцкая царква лічыла выгадным для сябе ўзмацняць уладу манархаў, бачачы ў ёй гарантыі ўласных палітычных і маёмасных інтарэсаў. Усталяваўся ўжо ўзгаданы «веравызнаўчы», ці прыдворны, абсалютызм, і ажыццявілася «адзінства алтара і трона». Такая сітуацыя разгортвалася ў дзяржавах іспанскіх і аўстрыйскіх Габсбургаў і Францыі. Да ўмацавання абсалютнай манархіі прывяла і Трыццацігадовая вайна – «вялікае рэлігійная міжусобіца ў Германіі» [2, с.77–78].

У прыватнасці, у Германіі, Рэфармацыя, праведзеная «зверху», стала сродкам узмацнення княжацкай улады, і княжацкі абсалютызм набыў тут канфесійны характар [3, с.395–399]. Паводле Вестфальскага міру, імперскія князі сталі фактычна незалежнымі гаспадарамі. Імператары ж не мелі ніякай рэальнай улады. Больш таго, паводле ўмоў выбрання, яны былі абавязаныя дапамагаць князям супраць іх падданых. Паступова дваранства германскіх зямель ператварылася ў прыдворную знаць, святарства было ў падпарадкаванні, а гарады, акрамя імперскіх, не карысталіся свабодай [4, с.34–37].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Для айчынный гістарыяграфіі значную цікавасць уяўляе сюжэт, прысвечаны рэлігійнаму жыццю Рэчы Паспалітай у часы Рэфармацыі і контррэфармацыі, які Карэеў адлюстраваў у шэрагу сваіх прац.

Карэеў указвае на верацярпімасць і рэлігійную свабоду ў Польшчы ў перадрэфармацыйныя і рэфармацыйныя часы. Па сутнасці ніякіх сур'ёзных супярэчнасцей паміж Рымам і Польшчай, манархіяй і грамадствам не існавала; у Польшчы не было расколу, як у Англіі, на прыхільнікаў епіскапальнай царквы з ідэяй абсалютызму і ідэолагаў народаўладдзя з радыкальным пратэстантызмам, Польшча не магла параўноўвацца і з Германіяй, на поўначы якой Рэфармацыя мела ўсенародную падтрымку [5, с.27–29, 61–63, 76]. У такіх умовах Сігізмунд Аўгуст II мог правесці рэфармацыю «зверху», умацаваць манархічную ўладу, але гэтага зроблена не было, і ў значнай меры таму, што па асабістых якасцях Сігізмунд II Аўгуст – не Генрых VIII, ён не быў прыгодны для такой місіі [5, с.75–76, 83–84, 102–104]. Вынікам было ўсталяванне каталіцызму, аслабленне манархічнай улады, якія праходзілі паралельна з пашырэннем шляхецкіх вольнасцей [5, с.27–28].

У перыяд ужо ўзгаданай Трыццацігадовай вайны Рэч Паспалітая магла б падтрымаць Чэхію, умацаваць свой уплыў на паўночным усходзе Германіі, але быў выбраны шлях супрацоўніцтва з Габсбургамі і каталіцызмам. Уладзіслаў IV завяршыў шэраг памылак польскай манархіі, аддаўшы Прусію Брандэнбургу і адмовіўшы кардыналу Рышэлье ў прапанове ўступіць у антыгабсбургскі саюз [6, с.177–185]. Узмацніўшы такім чынам Габсбургаў і Гогенцолернаў, не маючы трывалых сфер уплыву, Польшча зрабілася апірышчам каталіцызму, а «пры такім характары польскага панавання на рускіх землях адпадзенне іх ад Рэчы Паспалітай было толькі пытаннем часу» [6, с.198].

Такім чынам, у ранні Новы час каталіцкая царква пакінула прэтэнзіі на панаванне ў палітычнай сферы грамадства і падпарадкаванне сабе абсалютных манархаў, таму што не мела для гэтага дастатковых палітычных і матэрыяльных магчымасцей. Папская ўлада заключае саюз з манархічнай уладай, аб'ектыўна садзейнічаючы яе ўзмацненню, а ў пратэстанцкіх краінах падпарадкоўваючыся манархіі, але ўсё роўна захаваўшы свае сацыяльныя прывілеі. Пэўны ўдар па матэрыяльных сродках каталіцкай царквы і яе духоўным панаванні быў нанесены ў перыяд

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

«асвечанага абсалютызму», калі з розным поспехам праводзіліся антыклерыкальныя рэформы ў Аўстрыі, Іспаніі, Партугаліі, Італіі.

Існуючы як палітычныя партнёры, свецкая і царкоўная ўлада, тым не менш вырашала адну задачу, забяспечваючы ўзаемныя гарантыі. Іншая справа, што ступень актыўнасці каталіцкай і праваслаўнай царквы ў адносінах да свецкай улады была markednaй. Так, каталіцкая царква была актыўнай нават у перыяды значнага аслаблення свайго ўплыву ва ўнутраных і міжнародных справах. Што ж датычыцца праваслаўнай царквы, то яна, па візантыйскай традыцыі, была засяроджана на сваім унутраным жыцці, будучы падпарадкаванай свецкай уладзе. Рэформы Пятра I, секулярызацыя і еўрапеізацыя жыцця, а таксама ўсталяванне Свяцейшага Сінода фактычна ператварылі царкву ў адзін з інструментаў дзяржаўнай палітыкі расійскіх манархаў.

---


1. *Кареев, Н. И.* Философия культурной и социальной истории нового времени (1300–1800). Введение в историю XIX века (основные понятия, главнейшие обобщения и наиболее существенные итоги истории XVI–XVIII вв.) / Н. И. Кареев. – СПб.: Тип. М. М. Стасюлевича, 1893. – 176 с.

2. *Кареев, Н. И.* Западноевропейская абсолютная монархия XVI, XVII и XVIII веков. Общая характеристика бюрократического государства и сословного общества «старого порядка» / Н. И. Кареев. – СПб.: Тип. М.М. Стасюлевича, 1908. – 452 с.

3. *Кареев, Н. И.* История Западной Европы в новое время: развитие культурных и социальных отношений: в 3 т. / Н. И. Кареев. – Изд. 5-е. – СПб.: Тип. М. М. Стасюлевича. – 1913–1915. – Т. 2: История XVI и XVII веков / Н. И. Кареев. – 1915. – 640 с.

4. *Кареев, Н. И.* История Западной Европы в новое время: развитие культурных и социальных отношений: в 3 т. / Н.И. Кареев. – Изд. 5-е. – СПб.: Тип. М. М. Стасюлевича. – 1913–1915. – Т. 3: История XVIII века / Н. И. Кареев. – 1913. – 640 с.

5. *Кареев, Н. И.* Очерк истории реформационного движения и католической реакции в Польше / Н. И. Кареев. – М.: Тип. А. И. Мамонтова и К°, 1886.

6. *Кареев, Н. И.* Polonica: сборник статей по польским делам (1881–1905) / Н. И. Кареев. – СПб.: Тип. М. М. Стасюлевича, 1905. – 268 с.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ